# Фальклор беларускай глыбінкі



## Што ні край, то звычай...

З чатырох краёў Беларусі — Брэстчыны, Гомельшчыны, Магілёўшчыны і Міншчыны — з'ехаліся шаноўныя людзі даволі сталага веку, са скрыпкамі, з бубнамі ды гармонікамі, у прыгожых строях, сваімі рукамі пашытымі-вышытымі. І песні загучалі даўнія-старадаўнія, напеўна-меладычныя, працяжна-спакойныя. А галасы!.. Ніякі мікрафон не патрэбен, адно толькі сапсуе, а то і саб'е з панталыку спевакоў-артыстаў. Але ніхто з іх сябе артыстамі не лічыць. І гэта правільна, бо народная творчасць, аўтэнтычнае мастацтва — гэта творчасць душы. Яна непадуладная тэхніцы, не падпарадкуецца акустцы залаў, яна арганічна і натуральна гучыць на волі, у натуральным асяроддзі, затое кранае душу, хвалюе сэрцы...

Больш як 20 гадоў таму такія канцэрты ладзілі этнамузыколагі ў Маскве, куды запрашалі выканаўцаў аўтэнтычных спеваў з беларускай глыбінкі. Гэтыя людзі, можна сказаць, "апошнія з магікан", бо за імі ніхто не ідзе: іхнія дзеці, а тым больш камп'ютэрызаваныя ўнукі не маюць ні жадання, ні духоўнай патрэбы пераймаць гэтае мастацтва. Але з другога боку, памiранне аўтэнтычнай культуры "аплакалі" яшчэ на пачатку XX стагоддзя, а мы ўжо ў XXI, аднак і сёння ўсё з той жа праблемай застаёмся.

## Навукоўцы і практыкі

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў з аншлагам прайшоў IV Рэспубліканскі этнаграфічны канцэрт "Фальклор беларускай глыбінкі" з удзелам выканаўцаў інструментальнай музыкі і аўтэнтычных твораў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Праходзіла гэтая імпрэза ў рамках III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур".

Арганізатары мерапрыемстваў — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў ды Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Рэктар універсітэта Барыс Святлоў падчас урачыстага адкрыцця канферэнцыі адзначыў: "Падобныя канферэнцыі маюць галоўнай мэтай і задачамі абмен вопытам у галіне правядзення палявых даследаванняў, апрацоўку, захаванне, выданне матэрыялаў, стварэнне агульнай інфармацыйнай прасторы, абмеркаванне эксперыментальных метадык, альтэрнатыўных, апрабацыя іх у палявых умовах. Сёння прыйшоў час збіраць камяні, ствараць вялікую прастору па вывучаемым прадмеце".

Канферэнцыя мела шырокае прадстаўніцтва. Для ўдзелу запрошаны кіраўнікі і спецыялісты абласных і раённых упраўленняў і аддзелаў культуры, навукова-метадычных цэнтраў, выкладчыкі і навукоўцы вядучых вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў культуры Беларусі.

Вельмі важнай была сустрэча навукоўцаў-тэарэтыкаў і выканаўцаў-практыкаў, якія былі прадстаўлены на этнаграфічным канцэрце "Фальклор беларускай глыбінкі" такім чынам: аўтэнтычныя фальклорныя гурты "Набіліцы" са Старадарожскага раёна Мінскай вобласці, "Медуніца" з Мазыршчыны Гомельскай вобласці, "Суседачкі" з Хоцімскага раёна Магілёўшчыны і гурт з вёскі Дзятлавічы Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці.

Аб'ядноўвала, зштоўвала сюжэтную канву канцэрта вясельная традыцыя.

## Вяселле — гэта беларуская опера

Вяселле — гэта і сапраўды вялікая, іншы раз разлічаная на некалькі дзён дзея ці абрад, у якім удзельнічае вялікая колькасць дзейных асоб і гледачоў. Відавочна, што гэта ці не найбольш важная падзея ў жыццёвым коле чалавека, мо таму і самая распаўсюджаная ды захаваная сярод традыцыйных абрадаў беларусаў. Іншая справа, што вяселле (ад слова *весялосць, весяліцца*) сённяшнім днём нярэдка ператвараецца ў шумную гулянку і толькі талковы вядучы не дазваляе ператварыць яго ў п'янку, але іншы раз пераварочвае ўверх нагамі ўсе традыцыі.

Ад традыцыйнага вяселля цяпер мала што захавалася, хіба што вясельныя каравайныя сцэны. Таму вельмі важна, што гэтыя старадаўні вясельны абрад беларусаў, спеўныя традыцыі розных рэгіёнаў сталі асноўнай канвой этнаграфічнага канцэрта. Важна і тое, што кожны раз гэтая імпрэза ладзіцца найперш для студэнтаў і для навукоўцаў, адбываецца перадачатрансляцыя, як кажуць, наўпрост, ад носьбітаў — моладзі. І трэба бачыць рэакцыю маладых людзей, студэнтаў, якія выдатна адчуваюць магутную энергетыку народных спеваў і рэагуюць адэкватна, па-сучаснаму падтрымліваючы вясковых выканаўцаў, шчасліва-задаволеных пасля такіх сустрэч.

Яшчэ больш задаволеныя жанчыны падарункамі — вялікімі насценнымі гадзіннікамі з памятнай гравіроўкай, якія былі ўручаны кожнаму ўдзельніку пасля канцэрта. Не менш важна было атрымаць годна афармлены дыплом.

## Эксперымент

Калі на навуковай ніве падчас канферэнцыі праходзілі спрэчкі па тэрміналогіі, то практыкі наладзілі сапраўдны эксперымент. У чым яго сутнасць?

Вядомы этнамузыколаг, кандыдат мастацтвазнаўства Тамара Варфаламеева распавяла, што пры падрыхтоўцы этнаграфічнага канцэрта ўзнікла ідэя: паказаць, па-першае, што на адну рытмічную форму (а іх усяго восем) у розных рэгіёнах нашай краіны спяваюць розныя мелодыі. Гучанне атрымліваецца абсалютна рознае. Па-другое, існуюць політэкставыя напевы, калі на адзін і той жа напеў гурты могуць спяваць мноства розных тэкстаў. Такі напеў з'яўляецца своеасаблівым знакам-сімвалам вясельнага абраду.

Навукоўца, вялікі энтузіяст і даследчык песеннай спадчыны Ірына Мазюк, кіраўнік фальклорнага гурта "Кудмень" таксама сцвярджае, што ў кожнай мясцовасці свае вясельныя традыцыі. У кожнай з гэтых традыцый у вясельным матыве ёсць свае рытма-складовыя заканамернасці. Яна абышла-аб'ехала практычна ўсе рэгіёны Беларусі і вызнала, адшукала ў абласцях тыя лакальныя асяродкі, дзе яшчэ нейкім цудам захаваліся жывыя традыцыі і ёсць так званыя носьбіты, захавальнікі гэтых традыцый. На вялікі жаль, іх штогод, штомесяц менее, сыходзяць бабулькі, запявалы, лідэры, а без іх фальклорны гурт гасне, таму вельмі важна паспець зафіксаваць на сучаснай тэхніцы, занатаваць, пакінуць для нашчадкаў, для гісторыі сваю найкаштоўную спадчыну. Вядома, ёсць запісаныя, уключаныя ў зборнікі тэксты тых жа вясельных песень, але яны ніякім чынам не могуць перадаць ані пластыкі рухаў, ані спеваў, ні тым больш прыгажосці мясцовых строяў.

Асабліва моцная, як сцвярджае Ірына Мазюк, палеская "балотная" традыцыя, калі захаваўся поўны гурт, калі вытрымліваюцца тэмбры, як там кажуць, "тоўсты" і "тонкі", тады спевы ўражваюць масівам, незвычайным гучаннем і адчуваецца такі асаблівы палескі "космас балот". Дарэчы, у Польшчы рэгулярна праходзіць Міжнародны фестываль аўтэнтычнага фальклору "Песні балот" і сёлета этнаграфічны гурт з в. Лобча Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці быў яго ўдзельнікам.

Па выніках канферэнцыі рыхтуецца да выдання зборнік, у якім будуць аб'яднаны тэксты выступленняў. Самі навукоўцы, выкладчыкі, госці з розных ВНУ адзначалі падчас канферэнцыі, што сустрэча тэарэтыкаў-навукоўцаў і практыкаў вельмі патрэбная. Калі б яны былі паасобку і самі па сабе працавалі і не выводзілі гэта на ўзровень педагагічнага працэсу, сцэнічнага і іншага ўзроўню грамадскага і навуковага, то карысці ад таго было б мала. Навукоўцы проста абавязаны ведаць практыкаў. Пераважная большасць з іх не пакідаюць магчымасці практычна працаваць — у спевах, у практычным выкладанні і сцэнічнай папулярызацыі сваіх ведаў. У кожнага свае шляхі, і ўсе яны добрыя, абы толькі не было падмены панятцяў і фальсіфікацыі, таму што сёння ў папулярызацыі фальклорных ведаў ёсць пэўная доля папулізму і скажэнне асобных рэалій і фактаў. А насамрэч у папулярызацыі фальклору нічога дрэннага няма, калі яна робіцца прафесійна і якасна. Фальклор — адзін з фактараў нашага нацыянальнага выжывання, таму мы павінны трымацца разам.



**Галіна СУША**

*Фота Вольгі Лабачэўскай*